# Мазырскаму дзяржаўнаму педагагічнаму ўніверсітэту імя І. П. Шамякіна — 80 гадоў

Гісторыя Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна бярэ свой пачатак у 1944 годзе, калі ў Мазыры была адноўлена дзейнасць Рагачоўскага настаўніцкага інстытута, пасля чаго ён стаў называцца Мазырскім настаўніцкім інстытутам. Установа адукацыі рыхтавала педагогаў для V—VII класаў сярэдняй школы і выконвала значную ролю ў арганізацыі адукацыйнага працэсу на Палессі. У складзе інстытута функцыянавалі аддзяленні мовы і літаратуры, фізіка-матэматычнае і гісторыка-геаграфічнае, завочнага навучання, падрыхтоўчае. Першы выпуск маладых спецыялістаў адбыўся ў 1946 годзе: для школ Палесся падрыхтавалі 190 настаўнікаў гісторыі, мовы і літаратуры, фізікі, матэматыкі, прыродазнаўства і геаграфіі. У 1952 годзе Мазырскі настаўніцкі інстытут пераіменавалі ў Мазырскі педагагічны інстытут, а ў 1964-м прысвоілі імя Н. К. Крупскай. З 1992 года ва ўстанове вышэйшай адукацыі функцыянуе аспірантура. У 2002-м яна атрымала статус універсітэта, а ў 2006-м — імя народнага пісьменніка Беларусі, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча Івана Пятровіча Шамякіна.

Зараз Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна — адна з самых значных устаноў вышэйшай адукацыі, навуковы і культурны цэнтр Палесся. Адукацыйны працэс ажыццяўляецца на наступных факультэтах: тэхнолага-біялагічным, філалагічным, фізіка-інжынерным, дашкольнай і пачатковай адукацыі, фізічнай культуры, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў.

Універсітэт рыхтуе настаўнікаў па вучэбных прадметах сярэдняй школы, а таксама па шырокім коле дысцыплін для прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Важным кірункам дзейнасці з'яўляецца павышэнне якасці рэалізацыі адукацыйных праграм. Прафесарска-выкладчыцкі састаў вядзе актыўную работу па арганізацыі вучэбнага працэсу. Супрацоўнікі кафедр рыхтуюць вучэбныя дапаможнікі і электронныя падручнікі, электронныя вучэбна-метадычныя комплексы, вучэбныя праграмы, аўтарскія курсы лекцый. Усе матэрыялы распрацоўваюцца з улікам навейшых дасягненняў навукі, тэорыі і методыкі выкладання вучэбных дысцыплін. Універсітэт наладзіў трывалыя адукацыйныя, навуковыя, творчыя сувязі з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі, навукова-даследчымі інстытутамі і іншымі арганізацыямі як у Рэспубліцы Беларусь, так і блізкага і далёкага замежжа.

Ва ўстанове вышэйшай адукацыі вялікую ўвагу надаюць навуцы. Навукова-даследчая дзейнасць накіравана на распрацоўку праблем фізікі цвёрдага цела, оптыкі і галаграфіі, экалогіі Палесся, інавацыйных тэхналогій, мовазнаўства і літаратуразнаўства, гісторыі і культуралогіі і інш. За гады дзейнасці Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта на яго базе сфарміраваліся навукова-педагагічныя школы біялагічнай разнастайнасці і праблем экалогіі,

кагерэнтнай оптыкі і галаграфіі, фізікі трываласці і пластычнасці, праблем лінгвістычнага і лінгваметадычнага даследавання тэксту, праблем беларускай анамастыкі і тапанімікі, этнапедагогікі Беларусі. Вынікі даследаванняў паспяхова выкарыстоўваюцца ў працы вядучых прадпрыемстваў Мазыра і Гомельскай вобласці. Ва ўніверсітэце штогадова праводзяцца навуковыя рэспубліканскія і міжнародныя канферэнцыі, семінары. Выдаецца часопіс «Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна».

У навучальнай установе дзейнічаюць музей этнаграфічнай культуры Палескага краю і гісторыі ўніверсітэта, навукова-метадычны цэнтр русістыкі, цэнтр педагагічнай дэанталогіі і інш.

**Спіс літаратуры па тэме**


**1.** Мазырскі педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. — Мінск, 1999. — Т. 9. — С. 516.

**2.** Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина // Республика Беларусь : энциклопедия : в 7 т. — Минск, 2007. — Т. 5. — С. 182, 188.

**3.** Мазырскі педагагічны інстытут імя Н. К. Крупскай // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. — Мінск, 1999. — Т. 5. — С. 41.

**4.** Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. — Т. 3. Гомельская область : в 2 кн. — Минск, 2013. — Кн. 2. — С. 61.

**5.** Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна // Культура Беларусі : энцыклапедыя : у 6 т. — Мінск, 2014. — Т. 5. — С. 291.

**6.** Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина // Вузовская наука Беларуси / сост.: С. Г. Девяткова, Т. И. Жуковская, В. Ф. Николайчук. — Минск, 2017. — С. 252—259.

**7.** *Валетов, В. В.* Мозырскому государственному педагогическому университету имени И. П. Шамякина — 65 / В. В. Валетов // Вышэйшая школа. — 2009. — № 3. — С. 21—24.

**8.** *Валетов, В. В.* Мозырский государственный педагогический университет им. И. П. Шамякина: на пути развития / В. В. Валетов // Вестник славянских вузов. — 2009. — № 1. — С. 64—67.

**9.** *Валетов, В. В.* Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина — 70 славных лет / В. В. Валетов // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. — 2013. — № 4. — С. 3—8.

**10.** Учреждение образования «Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина». — Мозырь : МГПУ, 2019. — 39 с.

**11.** *Журлова, И. В.* Стратегические направления интернационализации высшего образования (из опыта международного сотрудничества УО МГПУ им. И. П. Шамякина) / И. В. Журлова, Т. В. Палиева, С. В. Матвеева // Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. — 2020. — № 2. — С. 80—87.



***Кацярына Дзмітрыеўна Варанько,***
*вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*